**САЛО́ДКАЯ** Святлана Аляксандраўна (н. 7.12.1958, в. Дудзічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. спявачка (лірычнае сапрана). Засл. арт. Беларусі (1990). Жонка У.І.*Салодкага*. Скончыла Баранавіцкае муз. вучылішча (1978). З 1978 салістка Дзярж. нар. хору Беларусі, з 1985 — ансамбля нар. музыкі «Свята» і Дзярж. ансамбля танца Беларусі, адначасова спявае ў дуэце з Салодкім, захоўваючы арыгінальную нар. манеру выканання. З 1994 адна са стваральніц і салістка ансамбля нар. песні «Вяселле». Валодае яркім голасам сакавітага тэмбру, выкананню ўласцівы выразнасць, задушэўнасць. У рэпертуары пададзеныя ў рэгіянальных традыцыях спеваў бел. нар. песні, у т.л. «Пасею гурочкі», «Грачанікі», «А й на дварэ дробен дождж ідзе» (вясельная). Сярод бел. нар. песень, выкананых у дуэце, «Цячэ вада ў ярок», «Ой, хадзім, хадзімо», «Із-за лісу-гаю вода прыбувае». Пра С. і яе мужа зняты кінафільм. Лаўрэат міжнар. фестывалю ў Паўн. Карэі (г. Пхеньян, 1992). *Н.Г.Мазурына.*

**САЛО́ДКАЯ БУ́ЛЬБА**, тое, што *батат*.

**САЛО́ДКАЯ ГАРЭ́ЛКА**, у беларусаў і некат. інш. народаў вясельнае абрадавае пітво, якім частавалі сваякоў і бацькоў маладой за захаванне ёй цнатлівасці, маральнай чысціні. Наз. таксама «чырвоная гарэлка», «калінкі», «рожкі». Пасля шлюбнай ночы малады з дружкамі ехалі з бутэлькай С.г. да бацькоў маладой «на падзяку». С.г. рыхтавалі з падсаладжанай мёдам або цукрам і падфарбаванай чырвонымі ягадамі гарэлкі. На Пн Беларусі і ў Латгаліі С.г. варылі адмысловым спосабам у гліняным гаршку з рознымі духмянымі каранямі, кменам, мёдам або цукрам на прыпечку. Бутэльку з С.г. затыкалі галінкамі каліны і сцяблінкамі аўса, абвязвалі каляровым поясам або чырв. стужкай і загортвалі ў вышыты ручнік. Цешча, атрымаўшы яе, частавала маладога яешняй, а сваіх родных — С.г. У некат. рэгіёнах С.г. бралі з сабой бацькі маладой, калі ехалі на *пярэзвы*. *Л.А.Малаш.*

**САЛО́ДКІ** Уладзімір Іванавіч (н. 1.9.1956, чыг. ст. Галынец Магілёўскага р-на), бел. спявак (барытон). Засл. арт. Беларусі (1990). Муж С.А.*Салодкай*. Скончыў Мінскі ін-т культуры (1985). З 1979 артыст Дзярж. нар. хору Беларусі, з 1984 — ансамбля нар. музыкі «Свята». З 1985 спявае ў дуэце з Салодкай. З 1994 адзін са стваральнікаў і саліст ансамбля нар. песні «Вяселле», з 1996 саліст Дзярж. ансамбля танца Беларусі. Валодае голасам прыгожага тэмбру, шырокага дыяпазону. У рэпертуары бел., рус., укр. нар. песні, а таксама аўтарскія творы, у т.л. «А дзе ж ты, бурлак, валачыўся» (балада), «Чапурушачка», «У лузе каліна стаяла», «Кірыла Тураўскі» (У.Будніка). *Н.Г.Мазурына.*

**САЛО́ДЫШАЎ** Арцём Іванавіч (5.10.1910, в. Лазаравічы Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 27.1.1960), Герой Сав. Саюза (1945). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, з 1943 партызан, камандзір узвода партыз. палка на Магілёўшчыне. З


А.І.Салодышаў.

1944 на 2-м Бел. фронце. Камандзір стралк. аддзялення сяржант С. вызначыўся ў баі на Пд ад Магілёва, дзе пасля пераправы цераз Дняпро ў баі за в. Стайкі гранатамі знішчыў дзот. Пасля вайны на гасп. рабоце.

**САЛО́МА**, сухія сцёблы раслін, што застаюцца пасля малацьбы збожжавых і зернебабовых культур, таксама лёну, канапель і інш., з якіх выдалены лісце, суквецці, насенне. С. збожжавых культур — грубы баластны корм пераважна для буйн. раг. жывёлы ці дабаўка да сакаўных кармоў. Пажыўная каштоўнасць невял. — клятчаткі 35—45%, мала пратэіну (3—4%), мінер. рэчываў, вітамінаў. Для паляпшэння пажыўнасці С. здрабняюць, запарваюць, сіласуюць, апрацоўваюць хім. рэчывамі. Выкарыстоўваюць таксама на подсціл жывёле, у цэлюлознай і папяровай прам-сці, для прыгатавання буд. матэрыялаў (саману і саламіту), плеценых вырабаў. С. лёну і канапель — сыравіна для атрымання *трасты*, з якой вылучаюць тэкст. валокны.

**САЛОМАСІЛАСАРЭ́ЗКА**, машына для рэзкі саломы і здрабнення зялёнай масы пры падрыхтоўцы кармоў і нарыхтоўцы *сіласу*. Бываюць барабанныя (звычайна стацыянарныя, з прыводам ад электрарухавіка) і дыскавыя (перасоўныя, з прыводам ад трактара або электрарухавіка).

Рэжучы апарат працуе па прынцыпе нажніц, адным з лёзаў якіх з'яўляюцца вярчальныя нажы (на барабане або дыску), другім — лязо нерухомай працірэжучай пласціны. С. ўстанаўліваюць каля сіласных збудаванняў, у кармацэхах, каля пунктаў нарыхтоўкі саломы на корм або подсціл. Ручныя і конныя С. наз. *сячкарнямі*.

*Літ.*: Белянчиков Н.Н., Смирнов А.И. Механизация животноводства. 2 изд. М., 1983. *В.М.Кандрацьеў.*

**САЛОМАСКЛАДА́ЛЬНІК**, капнаўшчык, капаклад, навясное ці прычапное прыстасаванне да *збожжаўборачнага камбайна*, прызначанае для складання саломы ў копы. Збірае салому і мякіну (масу) з саламатрэса і ачысткі камбайна і перыядычна выкідвае